Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 24 САКАВІКА 1977 г.

№ 10 (1160)

Цана 2 кап.

ПА БДУ ІНФАРМАЦЫЯ

## Увага: конкурс

**РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА АБМЕРКАВАЛІ ПЫТАННЕ АБ ПРАВЯДЗЕННІ УНІВЕРСІТЭЦКАГА КОНКУРСУ НА ЛЕПШУЮ СТУДЭНЦКУЮ НАВУКОВУЮ РАБОТУ ПА ПРЫРОДАЗНАЎЧЫХ, ТЭХНІЧНЫХ І ГУМАНІТАРНЫХ НАВУКАХ.**

У адпаведнасці з планам мерапрыемстваў, прысвечаных 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, каардынацыйным планам развіцця НДРС ва універсітэце, з мэтай актывізацыі і далейшага развіцця навуковай творчасці студэнтаў універсітэта і паглыблення іх тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі рэктарат, партком, камітэт камсамола, прафком, савет па НДРС, навуковы студэнцкі савет універсітэта пастанавілі аб'явіць конкурс на лепшую студэнцкую навуковую работу па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках. Конкурс будзе праведзен у красавіку—чэрвені 1977 года па выніках 1976—1977 навучальнага года. Работы трэба прадставіць у саветы па НДРС факультэтаў да 30 красавіка.

Зацверджана Палажэнне «АБ УНІВЕРСІТЭЦКІМ КОНКУРСЕ НА ЛЕПШУЮ СТУДЭНЦКУЮ НАВУКОВУЮ РАБОТУ ПА ПРЫРОДАЗНАЎЧЫХ, ТЭХНІЧНЫХ І ГУМАНІТАРНЫХ НАВУКАХ». Саветам па НДРС факультэтаў і універсітзта неабходна забяспечыць арганізаванае і своечасовае правядзенне конкурсу, разгарнуць шырокую прапаганду задач і ўмоў конкурсу. Выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта, якім саветы па НДРС будуць накіроўваць работы для рэцэнзій, павінны своечасова разглядаць гэтыя работы.

Саветы па НДРС сумесна з кафедрамі павінны забяспечыць шырокі ўдзел у конкурсе студэнтаў усіх курсаў, звяртаючы асаблівую ўвагу на ўдзел студэнтаў І—ІІ курсаў. Аўтары 11 лепшых работ будуць узнагароджаны.

Работы, якія атрымаюць на універсітэцкім конкурсе першую катэгорыю, будуць рэкамендаваны на рэспубліканскі конкурс.

## На біяфаку

**АДБЫЛОСЯ СУМЕСНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ СТУДЭНЦКІХ НАВУКОВЫХ ГУРТКОЎ КАФЕДРЫ СІСТЭМАТЫКІ І КАФЕДРЫ ФІЗІЯЛОГІІ РАСЛІН БІЯЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.**

Ініцыятарам гэтага пасяджэння выступіла стараста студэнцкага навуковага гуртка кафедры фізіялогіі раслін Алена Прасвірніна. Студэнты абмяркоўвалі пытанне «Сіметрыя і асіметрыя ў прыродзе». Былі зроблены паведамленні аб сіметрыі ў будове біялагічных макрамалекул, клетак раслін і іх органаў.

Актыўны ўдзел у спрэчках прынялі студэнты У. Галубкоў, А. Лярскі, М. Каберэц, М. Смактуновіч, М. Маньякоў і іншыя. Агульны ход пасяджэння гуртка ўмела накіроўвалі загадчык кафедры фізіялогіі раслін Г. Зубкевіч і іншыя выкладчыкі абедзвюх кафедр.

ПРЭС-ЦЭНТР СНС.

## Будзем сябрамі!

**НЯДАЎНА НА ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ БДУ ПРЫЙШЛО ПІСЬМО З КІЕЎСКАГА УНІВЕРСІТЭТА.**

Студэнты першага курса журфака звярнуліся да нас з прапановай супрацоўнічаць. Мы вырашылі падтрымаць прапанову. Будзем вучыцца лепшаму разам, пераймаць найбольш цікавае і карыснае. Гэта адзін бок справы. Па-другое — мы зможам больш даведацца пра Украіну, яе славутасці.

Д. БЫКАВА,
студэнтка І курса журфака.

60 КАСТРЫЧНІЦКАЯ ВАХТА БДУ

## ПА ЗАДАННЯХ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

У першы год дзесятай пяцігодкі далейшае развіццё атрымала навукова-даследчая работа студэнтаў (НДРС) усіх факультэтаў нашага універсітэта, што дазволіла палепшыць якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Усімі формамі НДРС ва універсітэце кіруе савет па НДРС і навуковы студэнцкі савет. У адпаведнасці з рашэннем бюро камітэта камсамола савет СНТ рэарганізаван у студэнцкі навуковы савет (СНС) на правах сектара вучэбна-навуковага аддзела камітэта камсамола.

У студэнцкіх навукова-даследчых лабараторыях і вылічальных цэнтрах працавалі 576 чалавек, якія выканалі 6 гаспадарчых дагавораў на суму 235,5 тыс. рублёў.

У СНДЛ кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ працягваліся работы па далейшаму развіццю метадаў і сродкаў вібраакустычнага кантролю стану ротарных машын. Аналізатар стану агрэгатаў авіяцыйнай тэхнікі, створаны студэнтамі, дэманстраваўся на ВДНГ СССР і ўзнагароджан бронзавым медалём выстаўкі (кіраўнік СНДЛ — ст. выкладчык В. Мікуловіч).

У СНДЛ пры кафедрах матэматычнага забеспячэння АСК (кіраўнік — дацэнт А. Змітровіч) і агульнага праграміравання (кіраўнік—загадчык кафедры Г. Драбушэвіч) распрацоўваліся і ўкараняліся інфармацыйна-пошукавыя сістэмы, задачы аўтаматызаваных сістэм кіравання вытворчасцю. Заказчыкі: камбінат верхняга трыкатажу (г. Пінск), швейная фабрыка (г. Бабруйск), машынабудаўнічы завод (г. Клімаўск), ЦНДІТК (г. Мінск) і інш.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

## ЭКЗАМЕН НА СВЯДОМАСЦЬ

...Ідзе грамадска-палітычная атэстацыя ў восьмай групе ІІІ курса факультэта прыкладной матэматыкі.

Гэтым хлопцам і дзяўчатам не так ужо доўга засталося быць студэнтамі. За парогам універсітэта іх чакае работа з людзьмі, многія стануць кіраўнікамі вытворчасці. Аб гэтым гаворыць старшыня атэстацыйнай камісіі, загадчык кафедры матэматычнага забеспячэння АСК М. Лепяшынскі:

— Цяпер вы вучыцеся арганізоўваць працу людзей. У вытворчасці вы адчуеце, як цяжка быць безініцыятыўным.

...Вось і першыя з атэстуемых. Пытанні да іх самыя розныя: ад складанага—«Калі адбудзецца другі тур муніцыпальных выбараў у Францыі?» і да «школьнага» — «Якія газеты вы чытаеце?» Але перш за ўсё ўлічваюцца якасць вучобы і ўдзел у рабоце грамадскіх арганізацый. З гонарам вытрымліваюць экзамен самыя «смелыя»: А. Багатырова, Н. Лобач, П. Якаўлеў, У. Абразцоў. Іх жыццёвая пазіцыя — быць актыўным у жыцці і вучобе. Менавіта ім належыць пачынанне: «Ад высокай якасці ведаў выдатнікаў — да поўнай паспяховасці групы».

Трэцюю гадзіну працуе камісія. Куратар групы і яго памочнік студэнтка V курса





Т. Лушчык задаволены адказамі. Ды што там адказы — і без выдатных адзнак яны вераць у сваіх калег-сяброў.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

**НА ЗДЫМКАХ:** ідзе атэстацыя; камсамолец І. ДЗЕРАНЧУК.

# ПАЛАЖЭННЕ

## АБ УНІВЕРСІТЭЦКІМ КОНКУРСЕ НА ЛЕПШУЮ СТУДЭНЦКУЮ НАВУКОВУЮ РАБОТУ ПА ПРЫРОДАЗНАЎЧЫХ, ТЭХНІЧНЫХ І ГУМАНІТАРНЫХ НАВУКАХ.

Конкурс праводзіцца ў красавіку—чэрвені ў рамках Усесаюзнага і рэспубліканскага конкурсаў з мэтай актывізацыі і далейшага развіцця навуковай творчасці студэнтаў універсітэта і паглыблення тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі і аб'яўляецца на чарговы навучальны год сумеснай пастановай рэктарата, савета па НДРС, навуковага студэнцкага савета.

У конкурсе могуць прымаць удзел студэнты і студэнцкія калектывы усіх факультэтаў універсітэта. Арганізацыйнае і метадычнае кіраўніцтва конкурсам здзяйсняе савет па НДРС універсітэта.

Конкурс праводзіцца па ўсіх спецыяльнасцях універсітэта.

На конкурс падаюцца студэнцкія навуковыя работы, абмеркаваныя на канферэнцыях, кафедрах, у гуртках, СНДЛ.

Дыпломныя работы, якія пададзены на конкурс, павінны мець паметку: «Дыпломная работа з'яўляецца завяршэннем навуковай работы, якая праводзіцца на працягу (указаць перыяд)».

Падача адной і той жа работы ў дзве конкурсныя камісіі не дапускаецца.

Работы падаюцца ў саветы па НДРС факультэтаў у тэрміны, якія вызначаны пастановай рэктарата, парткома, камітэта камсамола, мясцкома, прафкома, савета па НДРС, студэнцкага навуковага савета. Работы, якія пададзены пазней указанага тэрміну, на конкурс не прымаюцца.

Усе работы падаюцца ў адным экземпляры, акуратна і разборліва напісаныя ад рукі на рускай ці беларускай мове, збрашураваныя, у аб'ёме не больш як 50 старонак.

Работа суправаджаецца кароткай анатацыяй. На тытульным лісце работы ўказваецца: «На універсітэцкі конкурс 1977 г.», назва работы, прозвішча, імя, імя па бацьку, факультэт, курс, група аўтара; прозвішча, імя, імя па бацьку, кафедра, пасада, вучоная ступень і званне навуковага кіраўніка. Да работы прыкладаецца водзыў кіраўніка, кафедры, гуртка, СНДЛ.

Класіфікацыя работ праводзіцца па трох катэгорыях:

**І катэгорыя**—работы, якія з'яўляюцца закончанымі навуковымі даследаваннямі, маюць тэарэтычную і практычную каштоўнасць, асвятляюць коратка гісторыю пытання, змяшчаюць агляд літаратуры, лагічна і метадычна правільна пастаўленыя эксперыменты і дастаткова абгрунтаваныя вывады з іх, бездакорнае афармленне.

Да першай катэгорыі могуць быць аднесены таксама глыбокія літаратурныя агляды, прысвечаныя актуальным пытанням навукі і тэхнікі, змяшчаючыя крытычны аналіз прапрацаванай літаратуры і арыгінальныя вывады.

**ІІ катэгорыя** — работы, якія змяшчаюць элементы толькі навуковых даследаванняў, не маюць закончанасці работ першай катэгорыі, маюць недастаткова абгрунтаваныя вывады і дробныя памылкі ў афармленні.

**ІІІ катэгорыя** — работы рэфератыўнага, апісальнага характару, якія не змяшчаюць самастойных даследаванняў і глыбокага аналізу літаратурных крыніц.

Работы, у якіх ёсць грубыя памылкі, нядбайна, неахайна аформленыя, спісаныя з чужых работ — адхіляюцца.

Пры ацэнцы работ саветы па НДРС прымаюць рашэнне на аснове рэцэнзій па кожнай рабоце адкрытым галасаваннем большасці галасоў пры наяўнасці на даным пасяджэнні не менш дзвюх трэцей саставу савета.

Аўтары работ, якія аднесены да І катэгорыі, узнагароджваюцца граматай НДРС. Ім прысвойваецца званне лаўрэата конкурсу.

Аўтары лепшых навуковых работ узнагароджваюцца Ганаровым дыпломам НДРС і заахвочваюцца. Іх кіраўнікі ўзнагароджваюцца Ганаровым дыпломам НДРС.

На рэспубліканскі конкурс рэкамендуюцца работы з ліку работ І катэгорыі.

# ВЫШЕ ЭФФЕКТИВНОСТЬ РАБОТЫ ДОЗОРНЫХ!

На очередном заседании районного комитета была заслушана информация отдела организационной работы об итогах анализа статистических отчетов групп народного контроля за II полугодие 1976 года. Группы народного контроля района, выполняя решения XXV съезда КПСС и XXVIII съезда КПБ, октябрьского (1976 г.) Пленума ЦК КПСС, руководствуясь положениями и выводами, изложенными в речи Генерального секретаря ЦК КПСС товарища Л. И. Брежнева на Пленуме, заметно активизировали свою деятельность по осуществлению контроля за исполнением директив партии и правительства по борьбе за всемерный подъем экономики, дальнейшее укрепление государственной дисциплины и социалистической законности.

За II полугодие 1976 года головными группами народного контроля проведено 1.255 проверок (на 38,5 процента больше, чем в I полугодии). Внимание групп было сосредоточено на актуальных вопросах, от которых в значительной степени зависят результаты работы трудовых коллективов. Группами проведено 260 проверок выполнения производственных планов и заданий (на 39,7 процента больше, чем в I полугодии), 173 проверки по использованию производственных мощностей, материальных, трудовых ресурсов и денежных средств (на 48,7 процента больше, чем в I полугодии). Значительно больше, чем в I полугодии, проведено проверок по качеству выпускаемой продукции и выполнению работ, внедрению новой техники, технологии, научной организации труда и передового опыта, сохранности социалистической собственности, достоверности отчетных данных, проверок условий труда, быта, техники безопасности и т. д.

Вместе с тем нельзя закрывать глаза и на недостатки. Отдельные группы народного контроля района еще не добились массовости проверок, проводят их от случая к случаю. Так, группой народного контроля Белорусского управления гражданской авиации проведено за полугодие только две проверки, группой Госторгфонда при Госплане БССР — тоже две проверки. По три проверки за полугодие на «лицевом счету» группы народного контроля автоцентра ВАЗ и станции Минск — Восточный. Стоит ли говорить о том, что жизнь в этих группах не бьет ключом, а еле теплится.

Наблюдается и обратная картина. Некоторые группы народного контроля в ущерб качеству и актуальности проверок увлекаются количеством проверок. Группой народного контроля станции Степянка, к примеру, проведена за 6 месяцев 31 проверка, т. е. дозорные этой станции чаще, чем раз в неделю, проводили рейды и смотры. Понятно, что при такой сверхактивности особенно-то некогда было добиваться высокой эффективности контроля. Злоупотребляют большим числом проверок и группы народного контроля локомотивного депо, СУМ-96 треста «Строймеханизация», института «Минжелдорпроект», ресторана Минского аэропорта, линейного отдела МВД, института культуры. И не удивительно, что результаты проведенных проверок не всегда приносят желаемый эффект. Об этом свидетельствуют и статистические данные: лишь 77,7 процента проверок обсуждались на собраниях народных контролеров (в первом полугодии — только 62,6 процента). Так, к примеру, группой народного контроля опытно-механического завода треста «Белсельхозтехника» из шести проверок результаты лишь одной были рассмотрены на собрании народных контролеров, группой народного контроля СУМ-96 треста «Строймеханизация» было проведено 16 проверок, а результаты только трех были обсуждены на заседании группы. Дело дошло до того, что дозорные автоцентра ВАЗ провели три проверки и ни одну не обсудили на своем заседании.

Редко выносятся результаты проверок на обсуждение коллективов трудящихся. Во II полугодии 1976 года только 35,4 процента проверок обсуждены в коллективах. В I полугодии эта цифра была еще ниже — 30 процентов. Особенно неблагополучно в этом отношении обстоит дело в группах народного контроля Министерства автомобильного транспорта, городского объединения «Автотехобслуживание», участка энергоснабжения Минского отделения железной дороги, моторовагонного депо, домоуправлений №№ 2, 5 и 53, рыбокомплекса, ресторана Минского аэропорта, ВПЦ «Спецэнергоавтоматика».

И последний, весьма существенный упрек. Некоторые группы народного контроля не информируют избравшие их коллективы о своей работе, о выполнении данных им наказов. К числу таких групп относятся группы народного контроля Министерства мясной и молочной промышленности БССР, УВД Минского горисполкома, Белорусского управления транспортной милиции БССР, линейного отдела милиции в аэропорту, треста столовых Октябрьского района, опытно-экспериментального завода «Продмаш», оптово-розничного плодоовощного комбината и некоторых других.

Все это обязывает нас принять действенные меры по активизации работы групп, постов, каждого народного контролера. Председатели групп народного контроля района должны обратить особое внимание на качество проверок и устранение недостатков. В каждой группе необходимо ежемесячно проводить собрания народных контролеров, на которых обсуждать материалы проверок с заслушиванием объяснений должностных лиц. О результатах проверок и принятым по ним мерам необходимо регулярно информировать коллективы путем выступления народных контролеров на собраниях, в многотиражной, стенной печати и по местному радио.

**А. ПШЕНИН,**
**председатель Октябрьского районного комитета народного контроля г. Минска.**

# НА НОВЫЕ РУБЕЖИ

На днях в клубе строймеханизации состоялся актив органов народного контроля района.

С докладом «О задачах органов народного контроля района в связи с решениями октябрьского (1976 г.) Пленума ЦК КПСС и речью на Пленуме Генерального секретаря ЦК КПСС Л. И. Брежнева и постановлением КНК СССР по отчету Минского городского комитета народного контроля» выступил председатель районного комитета А. Т. Пшенин.

В докладе отмечалось, что промышленность района досрочно, 28 декабря, завершила план прошлого года. При этом объем промышленного производства возрос на 16,7 процента, производительность труда — на 13,5. Сверх задания произведено продукции на сумму более 8 миллионов рублей. В этом немалая заслуга и органов народного контроля района. Работая под руководством райкома партии и партийных организаций, они внесли значительный вклад в осуществление экономической и социальной политики партии, в укрепление трудовой и государственной дисциплины, содействуют развитию творческой активности масс, повышению ответственности каждого работника за порученное дело.

Однако докладчик указал и на то, что не все группы и посты народного контроля района действуют активно, целенаправленно.

В прениях по докладу выступили старший мастер ПТО «Интеграл», председатель цеховой группы В. К. Волокитин, председатель группы народного контроля завода медпрепаратов Р. В. Куницкий, председатель цеховой группы народного контроля 1-го автобусного парка В. Е. Жолондевский, председатель группы народного контроля ВРЗ им. Мясникова И. А. Крец и другие. На активе выступил и. о. начальника отделения ОБХСС отдела внутренних дел Октябрьского райисполкома В. А. Селивончик. Он отметил, что работниками ОБХСС отдела внутренних дел совместно с общественностью проведено в 1976 году 175 рейдов, направлено в организации 109 информаций и представлений, указывающих на условия совершения хозяйственных преступлений. В результате профилактических действий государству возмещены материальные ценности на 8.168 рублей. Однако, как отметил выступающий, и сегодня в районе еще имеют место случаи бесхозяйственности, небережного хранения материальных ценностей, неэффективного использования сырья и дорогостоящего оборудования. Серьезную озабоченность вызывает и положение дел с хищениями социалистической собственности на предприятиях района.

Обобщил итоги работы актива председатель Минского городского комитета народного контроля Н. А. Ремизевич.

Участники актива приняли развернутое постановление, в котором намечены конкретные рубежи дозорных по выполнению постановления КНК СССР по отчету Минского городского комитета народного контроля.

Выпуск № 5

# Страница НАРОДНОГО КОНТРОЛЯ

ОКТЯБРЬСКОГО РК НК
г. МИНСКА

# КОГДА ПРИНИЖЕНА ТРЕБОВАТЕЛЬНОСТЬ

Если вам доведется побывать на территории слесарно-сборочного участка опытно-экспериментального завода «ВНИИТИМЖ», то вы, наверняка, обратите внимание на огромные прессы — гидравлический и три механических. Привлекают они внимание не своеобразием конструкции, а тем, что в рабочее время прессы бездействуют.

А если вы зайдете затем в отдел кадров завода, то убедитесь и в том, что нет здесь ни одного станочника по профессии, позволяющей работать на этих прессах.

Как выявили дозорные района, на этом заводе не используется оборудования ни много ни мало на 24 тысячи рублей. Да прибавьте сюда более чем на 10 тысяч рублей излишнего, так сказать, «резервного» оборудования, которое руководство завода приобрело «на всякий случай». Вот и получится, что всего здесь не работает, а, следовательно, «заморожено» и не дает отдачи примерно 6,5 процента всего оборудования. Стоит ли удивляться теперь и тому, как используются и действующие агрегаты. За 1976 год коэффициент использования оборудования был равен 0,75, а по целому ряду оборудования, такому, как токарные и шлифовальные станки,—значительно ниже и этого уровня.

Когда дозорные проанализировали создавшееся положение, то выяснили, что одной из причин плохого использования механизмов являются потери рабочего времени, которые составили за прошлый год 10 процентов. Почти вдвое увеличилось количество прогулов, они составляют 1,2 дня на одного работающего. Заметим, что это превышает соответствующий показатель в целом по промышленности нашей республики в 6 раз. Увеличились на заводе потери рабочего времени по болезням (5 процентов к отработанному времени). Причем, почти половина заболеваний работников завода — простудные. На предприятии слабо заботятся об охране труда. Неявки на работу с разрешения администрации в 1976 году составили 0,4 дня на одного работающего, а объем недоданной за год продукции по причине прогулов и неявок на работу с разрешения администрации составил 1 процент от общего объема выпускаемой продукции. Всего же за истекший год из-за нерациональново использования рабочего времени заводом недодано 6 процентов от общего объема продукции.

Аналогичное положение сложилось и на опытно-механическом заводе треста «Белсельхозтехника». Здесь по сравнению с 1975 годом число неявок на работу возросло в 1976 году на 47 процентов, в том числе неявки с разрешения администрации и прогулы увеличились более чем в 2 раза.

Неудовлетворительно используется оборудование, коэффициент сменности которого составляет 1,58. В нарушение положения о социалистическом государственном предприятии в 1976 году по заводу не проведена инвентаризация основных средств и товарно-материальных ценностей. В нарушение установленных правил производится списание основных средств завода.

**А. СОКОЛОВ,**
**заведующий внештатным отделом РКНК по промышленности.**

Сатирическим пером

# Читай и... памятуй

В Древнем Риме законы вырубались на огромных камнях. А камни устанавливались на центральных площадях городов. Читай и памятуй, что можно и чего нельзя.

В наше время машины печатают законодательные постановления на бумаге. В миллионах экземпляров! Читай — руководствуйся... И сегодня, как и много веков назад, читают и, конечно же, руководствуются. Но, к сожалению, не везде.

Взять хотя бы проектно-технологическое бюро «Белглавнефтеснабсбыта». Имеются, скажем, здесь инструкции и схемы должностей и должностных окладов. Четко в них все оговорено, что называется, «от и до». Казалось бы, бери и руководствуйся. Ан нет. Проверкой поступивших в районный комитет народного контроля сигналов установлено, что в нарушение вышеназванного документа в проектно-технологическом бюро предусмотрена должность главного технолога с месячным окладом в 170 рублей, а за счет должностей инженеров и техников содержались четыре копировщицы и светокопировщица.

Имеют место и случаи, когда на временную работу на вакантные должности зачисляются инженерно-технические работники и служащие сторонних организаций без требования справок с основного места работы, и зарплата им выплачивалась согласно оклада, предусмотренного штатным расписанием. За последние полтора года на временную работу было зачислено два инженера-конструктора, четыре старших инженера, заместитель заведующего лабораторией, зав. сектором и зав. конструкторским отделом. Только за 10 месяцев 1976 года руководством проектно-технологического бюро допущено незаконное расходование государственных средств на содержание работников сверх утвержденной численности 1,3 тысячи рублей, допущена переплата в связи с выплатой завышенных должностных окладов в сумме тысячи рублей и других незаконных выплат на 2,8 тысячи рублей.

Постановлением районного комитета народного контроля от 27 января текущего года за нанесенный государству ущерб и в частичное его возмещение на начальника проектно-технологического бюро Н. М. Поршневу, старшего бухгалтера (на правах главного) В. П. Карпова и на бывшего начальника проектно-технологического бюро, ныне начальника отдела эксплуатации «Белглавнефтеснабсбыта» И. П. Поршнева произведен денежный начет в размере половины месячного оклада на каждого.

**А. НЕСТЕРОВИЧ.**

КАЛОНКА З ПРАЦЯГАМ

# РУХАЛЬНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ І ЗДАРОЎЕ

(Пачатак у № 9 ).

Такім чынам, заняткі фізічнымі практыкаваннямі з мэтай павышэння рухальнай актыўнасці ва ўмовах сучаснага грамадства з'яўляюцца найбольш эфектыўным способам барацьбы з гіпадынаміяй, якая адмоўна адбіваецца на здароўі чалавека. Адзін з буйнейшых савецкіх фізіёлагаў акадэмік В. В. Парын сказаў, што «фізічныя практыкаванні неабходны кожнаму з нас як паветра, якім мы дыхаем. Без іх не павінна праходзіць у чалавека ніводнага дня».

Асабліває значэнне маюць заняткі фізічнымі практыкаваннямі для людзей разумовай працы. У сістэме «рухальная актыўнасць ва ўмовах ВНУ» мы вычляняем наступныя падсістэмы: абавязковы курс фізічнага выхавання, заняткі ў спартыўных секцыях, самастойная трэніроўка.

Даныя даследаванняў гавораць, што заняткі спортам 2—4 гадзіны ў тыдзень з'яўляюцца зусім недастатковымі для захавання і ўмацавання здароўя. Найлепшым заняткам з'яўляецца трэніроўка ў спартыўнай секцыі пад кіраўніцтвам кваліфікаваных педагогаў.

Выкладчыкам, супрацоўнікам і студэнтам, якія не займаюцца ў спартыўных секцыях, мы настойліва рэкамендуем самастойную трэніроўку. Да яе адносяцца такія віды фізічных практыкаванняў, як гігіенічная гімнастыка (раніцай, днём, увечары), хадзьба, кросавы бег, спартыўныя гульні.

Кожны чалавек, які пачаў займацца фізічнымі практыкаваннямі, павінен разумець, што яны з'яўляюцца моцна дзейнічаючым сродкам. І калі аптымальныя нагрузкі садзейнічаюць умацаванню здароўя, то празмерныя могуць адбіцца адмоўна. Таму, акрамя ведання элементарных асноў спартыўнай трэніроўкі, небходна папярэдняя кансультацыя ўрача і ўвядзенне дзённіка самакантролю. У дзённіку рэгулярна (1—2 разы ў тыдзень) рэгіструюцца суб'ектыўныя і аб'ектыўныя паказчыкі. Да суб'ектыўных паказчыкаў адносіцца настрой, самаадчуванне, сон, апетыт, болі.

З аб'ектыўных паказчыкаў належыць фіксаваць вагу, частату дыхання, пульс у спакоі і хуткасць аднаўлення яго пасля нагрузкі. Паступовае зніжэнне пульсу ў спакоі (у нетрэніраванага чалавека 70—75 удараў у мінуту), сведчыць аб паляпшэнні дзейнасці сардэчнасасудзістай сістэмы.

**У. РЭЙЗІН.**

# ПАВЫСІЦЬ КВАЛІФІКАЦЫЮ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

Метадычным саветам кафедры фізічнага выхавання і спорту праведзена работа з выкладчыкамі кафедры па павышэнню іх метадычнага майстэрства. Выкладчыкі кафедры заслухалі шэраг паведамленняў па метадыцы правядзення ўрокаў фізічнага выхавання (лёгкая атлетыка, гімнастыка і плаванне). На трох метадычных занятках былі разгледжаны пытанні методыкі падрыхтоўкі і здачы норм комплексу ГПА.

Асаблівую цікавасць выклікала паведамленне заслужанага трэнера СССР П. Гойхмана. Ён прадэманстраваў выкладчыкам кафедры шэраг практыкаванняў на трэнажорах, якія дазваляюць накіравана развіваць пэўныя групы мышц у спартсменаў, якія спаборнічаюць у скачках у вышыню. Расказ і паказ практыкаванняў удала дапоўнен паказам аўтарскага фільма. Дэманстравалася не толькі тэхніка скачка способам «флоп», але і элементы скачка: разбег, пераход планкі. Адны метадычныя заняткі былі прысвечаны пытанню эвалюцыі тактыкі арыентавання на маркіраванай трасе за апошняе пяцігоддзе, псіхалагічным асаблівасцям арыентавання на зімовых маркіраваных трасах.

Выказана пажаданне праводзіць работу па павышэнню кваліфікацыі дыферэнцыравана. Выкладчыкам падрыхтоўчага аддзялення кафедры фізічнага выхавання і спорту пажадана даваць больш матэрыялаў па пытаннях методыкі навучання слухачоў і трэніроўць іх, па методыцы і тактыцы спартыўнага арыентавання.

**В. АКІМАЎ,**
**выкладчык кафедры фізвыхавання.**

# спорт

# ШКОЛА АЗДАРАЎЛЕНЧАГА АРЫЕНТАВАННЯ



**Пераможца другога этапа эстафеты на першынстве ВНУ БССР 1976 года Уладзімір ГУМІНСКІ.**

Ідэя стварэння школы аздараўленчага арыентавання пры Белдзяржуніверсітэце своечасовая і актуальная. Бо з яе дапамогай можна не толькі паспяхова папулярызаваць гэты від спорту, але і прыцягваць вялікую групу студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта да актыўнага адпачынку і загартоўвання, а таксама выяўляць таленавітых спартсменаў для зборнай каманды Белдзяржуніверсітэта і рыхтаваць студэнтаў і супрацоўнікаў да выканання нарматываў комплексу ГПА.

З мэтай навучання пачынаючых арыенціроўшчыкаў асновам арыентавання і прапаганды аздараўленчага арыентавання сярод студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта кафедра фізічнага выхавання і спорту разам з камітэтам камсамола і спартыўным клубам вырашылі адкрыць у красавікумаі школу аздараўленчага арыентавання (ШАА). Заняткі будуць праводзіцца на палігоне універсітэта ў Ждановічах два разы ў тыдзень: па чацвяргах з 16.00 да 18.00 і па нядзелях —з 10.00 да 18.00. Інструктары —грамадскія работнікі секцыі спартыўнага арыентавання універсітэта—будуць весці тэарэтычныя семінары і практычныя заняткі, на якіх навічкі засвояць элементы тактыка-тэхнічнай падрыхтоўкі і прымуць удзел у адным з відаў спаборніцтваў. Прычым удзельнікам будзе прадастаўлена права выбару дыстанцый па іх складанасці. Дазваляецца выступаць індывідуальна і ў саставе групы. Удзельнікаў не падзяляюць па ўзросту, кваліфікацыі і ступені фізічнай падрыхтоўкі. Дазваляецца праходзіць дыстанцыю трасы любым тэмпам (хадзьба, лёгкі бег ці змешаны рух). Праграма наступных стартаў ускладняецца з улікам патрабаванняў правіл спаборніцтваў. Удзельнікаў забяспечваюць компасамі і каляровымі картамі. Ім толькі неабходна мець даведку ўрача аб допуску па стану здароўя да ўдзелу ў спаборніцтвах па арыентаванню, гадзіннік і аловак.

Пасля засваення праграмы школы аздараўленчага арыентавання ўдзельнікі змогуць павышаць сваё майстэрства ў спаборніцтвах на прыз «Зялёнага стадыёна».

Коратка хочацца сказаць аб фізіялагічных асаблівасцях аздараўленчага арыентавання. Нікому не трэба даказваць, што прагулка па лесе з'яўляецца крыніцай бадзёрасці, здароўя, паляпшае настрой і самаадчуванне. Акрамя таго, пры спартыўным арыентаванні фізічная нагрузка ў спалучэнні з разумовай работай у лесе зараджае мозг творчай энергіяй і дабратворна ўплывае на нервовую і мышачную сістэмы, развівае лёгкія і ўмацоўвае дыхальную мускулатуру, трэніруе сардэчную мышцу і садзейнічае развіццю сасудзістай сістэмы, што прыводзіць да паляпшэння працэсу кровазвароту ва ўсіх органах і сістэмах. Рух у лесе ўзмацняе акісляльныя працэсы ў арганізме за кошт павышанага спажывання кіслароду. За адны заняткі ў лесе арыенціроўшчык траціць 500—700 кілакалорый энергіі і 1—1,5 кілаграма вагі.

Заняткі арыентаваннем на свежым паветры ўмацоўваюць нервовую сістэму, загартоўваюць арганізм і павялічваюць працаздольнасць чалавека. Вельмі вобразна сказаў аб карысці рухаў французскі ўрач XVIII стагоддзя Цісо: «Рух можа замяніць любыя лекі, але ўсе лячэбныя сродкі свету не ў стане замяніць дзеяння руху».




**Жаночая зборная універсітэта па спартыўнаму арыентаванню.**



**Выбар маршрута.**

## Спартыўныя навіны

### ПЕРАМОГА БАРЦОЎ УНІВЕРСІТЭТА

**У МАГІЛЁВЕ ПРАЙШЛО ПЕРШЫНСТВО ВНУ БССР ПА КЛАСІЧНАЙ БАРАЦЬБЕ.**

У спаборніцтвах прынялі ўдзел каманды 12 ВНУ рэспублікі, у саставе якіх былі барцы высокай спартыўнай кваліфікацыі. Сярод удзельнікаў — 26 майстроў і 42 кандыдаты ў майстры спорту.

Упартая барацьба разгарнулася паміж камандамі БДУ, МРТІ, БПІ і Гомельскага універсітэта. Да апошняга дня спаборніцтваў не было зразумела, хто пераможа.

Першае месца і званне чэмпіёнаў XX студэнцкай спартакіяды БССР заваявалі спартсмены нашага універсітэта. На другім месцы — барцы МРТІ, на трэцім — зборная Беларускага політэхнічнага інстытута.

**В. ХАРУК,**
студэнт III курса геафака, майстар спорту па класічнай барацьбе.

### АДКРЫЦЦЁ СЕЗОНУ

**АДБЫЛОСЯ ЗІМОВА-ВЯСНОВАЕ ПЕРШЫНСТВО СЕКЦЫІ СПАРТЫЎНАГА АРЫЕНТАВАННЯ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

На трасу выйшла 10 удзельніц і 5 удзельнікаў — мацнейшых арыенціроўшчыкаў секцыі. Нягледзячы на складаныя ўмовы надвор'я, а таксама на тое, што гэты старт быў першым у сезоне, спартсмены прадэманстравалі высокі ўзровень тактыка-тэхнічнай падрыхтоўкі і волю да перамогі.

У жанчын І месца з часам 53 мін. 21 сек. заняла С. Атамановіч, ІІ месца — В. Мастыка (55 мін. 43 сек.). На ІІІ месцы — Т. Пармонік. Усе трое — з механіка-матэматычнага факультэта.

У мужчын І месца з часам 61 мін. 28 сек. заняў двухкратны чэмпіён універсітэта па спартыўнаму арыентаванню А. Мялешка (фізічны факультэт). Г. Жызнеўскі, які заняў ІІ месца (радыёфізічны факультэт), прайграў яму 2 мін. 10 сек. (63.38). ІІІ месца заняў С. Еўлаш (Акадэмія навук БССР).

**А. ШПАКОЎСКІ,**
галоўны суддзя спаборніцтваў.
**І. БЯСПАЛАЎ,**
начальнік дыстанцый.

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ.

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 465. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. АТ 01146